З гумарам аб сур'ёзным

# ПРА АГРАТУРЫЗМ РАСКАЖА... «СЕЛЯДЗЕЦ»

**Здзівіць каго-небудзь студэнцкім часопісам у нашы часы цяжка. Але «Селядзец», які выпускаюць студэнты факультэта міжнародных адносін БДУ, уражвае — акрамя незвычайнай назвы, у яго не зусім звыклы змест: выданне прысвечана айчыннаму агратурызму, а самі матэрыялы напісаны з гумарам. Мы сустрэліся з галоўным рэдактарам выдання трэцякурснікам ФМА Цімурам ХОДЗІНЫМ, і распыталі яго пра журналісцкі досвед і погляды моладзі на развіццё айчыннага турызму.**



***— Цімур, як так сталася, што студэнты факультэта міжнародных адносін пачалі выпускаць часопіс, ды яшчэ і пра агратурызм?***

— Нічога дзіўнага тут няма — я студэнт спецыяльнасці «Менеджмент сферы турызму». Пасля трэцяга курса ўсе выбіраюць адзін з трох кірункаў, па якім яны будуць вучыцца далей: «Уязны і выязны турызм», «Сфера гасціннасці» або «Агратурызм». Сёлета, праўда, студэнтаў на апошні не набралася, але на базе Беларускага грамадскага аб'яднання «Адпачынак у вёсцы» быў створаны філіял кафедры міжнароднага турызму ФМА. Ініцыятарам была наша выкладчыца Валерыя Кліцунова, якая ўжо даўно папулярызуе ў Беларусі агратурызм. Уключыць выданне тэматычнага часопіса ў навучальную праграму філіяла таксама было яе ідэяй, таму можна сказаць, што гэта быў загад «зверху». Мяне прызначылі галоўным рэдактарам і паставілі перад фактам — трэба зрабіць цікавае выданне.

***— І як было без практыкі тое рабіць?***

— Першы нумар трэба было выпусціць вельмі хутка, літаральна за тыдзень. І гэта пры тым, што ў нас ужо пачалася заліковая сесія, трэба было тэрмінова закрываць усе «хвасты» і адначасова займацца часопісам. Усё рабілася ў такім рытме, што звярстаны канчатковы варыянт «Селядца» я ўпершыню ўзяў у рукі толькі за пяць хвілін да яго прэзентацыі.

З пошукам аўтараў праблем не было, у нас на факультэце ёсць свае газеты і часопісы, напрыклад, «ФМОn-line». Акрамя таго, заўсёды можна ўзгадаць, хто са знаёмых студэнтаў цікавіцца гэтай тэмай. Галоўнай складанасцю для нас былі тэхнічныя пытанні, у першую чаргу — вёрстка. На ФМА гэтаму не вучаць, таму нам дапамагаў хлопец з Інстытута журналістыкі БДУ. Дарэчы, большасць аўтараў з уласнай ініцыятывы напісалі свае матэрыялы па-беларуску.

Увогуле, мы імкнуліся не замыкацца на тэме агратурызму (ды і зусім стараліся не ўжываць гэтага слова), а рабіць часопіс, які быў бы цікавы любому маладому чытачу. Гэта было галоўнай задачай.

***— А назва?..***

— «Селядзец» расшыфроўваецца як «сельскі дзённік». Дарэчы, на прэзентацыі нас пакрытыкавалі за тое, што назва занадта адцягнутая ад тэматыкі. Але пазней я адшукаў для яе гістарычную падставу: у Вялікім Княстве Літоўскім селядзец быў нярэдкім «госцем» на сталах шляхціцаў.

***— Якія з артыкулаў першага нумара ты б адзначыў найперш?***

— Вось, напрыклад, на вокладку вынесены матэрыял пад загалоўкам «Шок! Што беларускі агратурызм робіць з людзьмі? Аповед ахвяры» пяцікурсніка Міхалая Ханіна, у якім ён проста жартаўліва распавядае пра сваё знаёмства з сельскім турызмам. Пяцікурсніца Марыя Відзевіч паўдзельнічала ў славутай «Жаніцьбе Цярэшкі» ў адной з аграсядзіб, напісала рэпартаж. Яшчэ адна пяцікурсніца, Юлія Ласіцкая, наведала аграсядзібу, у якой людзей лечаць пры дапамозе пчол, толькі не звыклым джаленнем, а адпачынкам на спецыяльным ложку, пад якім знаходзяцца вуллі. Я з'ездзіў у вандроўку ў Глыбокае і Паставы, таксама напісаў рэпартаж. А другакурсніца Алена Бекус правяла апытанку пра адпачынак у вёсцы.

***— Як распаўсюджваецца «Селядзец»? Папяровымі асобнікамі ці праз інтэрнэт?***

— Электронная версія размешчана на сайце ФМА, там кожны можа яе спампаваць. Яшчэ, наколькі я ведаю, БГА «Адпачынак у вёсцы» рассылае яго гаспадарам аграсядзіб. Ну і я сваім сябрам адпраўляў, куды ж без гэтага? Наступны нумар павінен выйсці ў верасні, і ў нас ужо ёсць шмат ідэй, як пашырыць аўдыторыю ці хаця б зрабіць часопіс больш цікавым.

***— Якой будучыню беларускага турызму бачаць самі студэнты? У прыватнасці, твае погляды на развіццё гэтай сферы?***

— Асабіста я лічу, што ў Беларусі неверагодна вялікі турыстычны патэнцыял. Але беларусы часам не звяртаюць увагі на тую спадчыну, якая ў нас засталася. Узяць, напрыклад, Мінск: гістарычная забудова на вуліцах Карла Маркса, Рэвалюцыйнай, Кастрычніцкай, іншых можа быць цікавая турыстам з Заходняй Еўропы. Нашы замкі і палацы здзіўляюць расіян. А тым, хто любіць адпачываць на прыродзе, варта ўзгадаць пра аграсядзібы. Іншая справа, як усё гэта рэалізавана. Калі, напрыклад, музеі не працуюць на святы... Неаднойчы ў невялікіх гарадах прыходзіў ва ўстановы, дзе не было экскурсавода. Для экскурсіі ім трэба загадзя тэлефанаваць! Пасля такога знікае жаданне нешта рабіць. Не трэба цурацца свайго мінулага, тым больш што ў нас ёсць чым ганарыцца.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

Гульні розуму

# Квэст як «машына часу»

## У моладзі папулярная новая забава

**Інтэлектуальныя гульні заўсёды знаходзяць сваіх прыхільнікаў. Могуць змяняцца іх форма і ўзровень складанасці, але сутнасць заўсёды адна: перамагаць сілай думкі. Як высвятляецца, для актыўнай моладзі ўжо не цікава проста аналізаваць і разважаць. Душа патрабуе дзеяння! Таму наўздагон звыклым гульням сталі з'яўляцца так званыя «квэсты ў рэчаіснасці».**

**Сёння ў Беларусі попыт на іх такі вялікі, што адкрываюцца ўсё новыя квэст-пляцоўкі. Пад апошнія арандуюць старыя прамысловыя памяшканні, падвалы і нават офісы. Унутры кожная з пляцовак перароблена такім чынам, каб гульцы адчувалі атмасферу месца, куды іх «пераносіць» сюжэт. Пра тонкасці стварэння паралельнай рэчаіснасці ў звычайным памяшканні, а таксама пра тое, чаму людзі розных узростаў з задавальненнем бавяць вольны час за такімі гульнямі, расказала адміністратар адной з квэст-пляцовак Настасся Конева:**

— Сюжэтныя гульні неверагодна захапляльныя. Уявіце, што вы можаце апынуцца дзе заўгодна і адчуць сябе на месцы іншага чалавека ў іншым жыцці. Прычым сюжэт можна выбраць самому. Адпаведна, напрыклад, у Манака рабаваць банкі. Ці апынуцца ў беларускім лесе ўлетку 1944 года. Між іншым, вось гэты квэст, які так і называецца — «Лета 44-га», — самы запатрабаваны сярод нашых гасцей усіх узростаў. Гэта і не дзіўна, бо ў нас з асаблівай пашанай ставяцца да ваеннага мінулага. Як развіваецца сюжэт? Уявіце, што вас разам з таварышамі схапілі ў палон немцы і зачынілі ў хляве. Каб пазбегнуць расправы, якая немінуча чакае ранкам, трэба выбрацца з будынка, абяззброіць ворага і прабрацца ў штаб да партызанаў. Пасля адчыніць сакрэтны бункер і абясшкодзіць яго. І ўсё гэта трэба паспець зрабіць, уклаўшыся ў адведзены час.

Па словах дзяўчыны, каб гуляць, не трэба мець нейкай асаблівай фізічнай падрыхтоўкі, не абавязкова быць кандыдатам навук. На шляху да перамогі некалькі галаваломак рашыць прыйдзецца, але нічога звышцяжкага там няма. Галоўнае, што вам трэба, — гэта ўважлівасць, гатоўнасць працаваць у камандзе і настрой на прыгоды. Тым больш што за гульнёй увесь час назіраюць адміністратары. Вы можаце быць упэўнены ў тым, што знаходзіцеся ў бяспецы, а ў хвіліну адчаю атрымаеце падказку (іх у арсенале адміністратараў бясконцае мноства).



— Усе гульні праводзяцца ў закрытых памяшканнях, але абсталяванне праўдападобнае настолькі, што адчуваюцца нават пахі. Над стварэннем адпаведнай атмасферы мы працуем з асаблівай увагай. Большая частка рэквізіту збіралася па ўсім свеце. Асабліва часта цікавыя рэчы выстаўляюць на продаж у Англіі і Злучаных Штатах. Шукаем такі "тавар" на блышыных рынках, барахолках, на розных сайтах і сярод знаёмых. Цікавыя дробязі лепш за што іншае дапамагаюць спраўляцца з галоўнай задачай пераўвасаблення — перанесці гульца ў іншую рэальнасць, — працягвае ўводзіць у курс справы Настасся. — Удзельнічае ў квэсце абавязкова каманда з двух—дзевяці чалавек. Да нас прыходзяць і проста сябры, ладзяцца і карпаратывы. Нават бывае такое, што знаёмяцца невялікімі камандамі на месцы, аб'ядноўваюцца і складаюць адну вялікую. Псіхалагічна вельмі карысна будаваць гульню такім чынам. Атрымліваецца, што ты гуляеш не супраць другой каманды ці кагосьці асабіста, а наадварот — робіш усё магчымае ў інтарэсах сваёй.

Квэсты папулярныя таму, што сёння модна быць разумным і кемлівым і ўмець гэтым карыстацца. Ды і людзі з сучасным рытмам жыцця цэняць свой вольны час і грунтоўна падыходзяць да выбару якаснага адпачынку. Квэст дае магчымасць на гадзіну вырвацца з прывычнага кола. Дзякуючы цікавым сюжэтам і арыентаванасці на камандную гульню мяняецца эмацыянальны фон чалавека. Бывае і такое, што ў працэсе гульні здзяйсняюцца дзіцячыя мары накшталт выратавання чалавецтва ці хаця б сваёй каманды. У любым выпадку, нават самы прымітыўны квэст куды цікавейшы, чым звычайны пятнічны вечар, праведзены на канапе або ў сеціве.

...На выхадзе з квэст-пляцоўкі я дачакалася студэнтку БДТУ Кацярыну Стэфановіч і супрацоўніка праваахоўных органаў Яраслава Бярозку, якія толькі што скончылі гульню, і папрасіла падзяліцца ўражаннямі.

**Кацярына:** — Засталіся вельмі задаволены. Галаваломкі былі цікавыя, хоць і не надта цяжкія. Але адчуванне, што вось-вось скончыцца наш час, прымушае сэрца біцца хутчэй.

**Яраслаў:** — За гульню на дваіх мы аддалі 500 тысяч рублёў, але іх не шкада. Я і не заўважыў, як праляцела адведзеная гадзіна. Уразіла гукавое суправаджэнне. І мне, як прыхільніку камп'ютарных гульняў, спадабаліся многія рэчы з абсталявання: карты, каскі, прадметы мэблі і адзення. Адзінае, хацелася б, каб гульня ішла хаця б па паўгадзіны больш. Нам часу не хапіла. І вось яшчэ: арганізатары забараняюць фатаграфаваць. Зразумела, што гэта ў нейкім сэнсе камерцыйная тайна, але так хацелася б зрабіць кадр-другі для «Інстаграма».

Сёння ў Мінску налічваецца трынаццаць квэст-пляцовак, кожная з якіх прапануе два і больш варыянтаў развіцця сюжэту гульні. У сярэднім на чалавека такая забава абыходзіцца ў 200 тысяч рублёў (у залежнасці ад канкрэтнага квэста і колькасці гульцоў). Працуюць пляцоўкі сем дзён на тыдні і, каб не прайграць канкурэнтам, прапановы ўвесь час абнаўляюць. Такім чынам, у беларусаў ёсць магчымасць выпрабаваць сваю кемлівасць у самых розных сітуацыях. Хто ведае, што нам у жыцці можа спатрэбіцца заўтра?..

**Дар'я АРЭФ'ЕВА,**
**студэнтка IV курса Інстытута журналістыкі БДУ.**

Народны альбом

# КАКТЭЙЛЬ ДЛЯ СЛЫХУ

**Гурт «Кактэйль Шаляпіна» ў канцы мінулага года запусціў краўдфандынгавы праект. Для Беларусі гэтая з'ява не новая, але яна яшчэ толькі набірае абароты. На сёння толькі тры беларускія гурты здолелі паспяхова сабраць неабходныя для запісу сродкі, сярод якіх і «КШ». Грошы пойдуць на першы альбом «Рэаніматары».**

Яны не маюць прадзюсара, у складзе калектыву — Аляксандр Юркоў (барабаны), Маргарыта Нога (скрыпка, бэк-вакал), Андрэй Сянькевіч (гітара, клавішныя, бэк-вакал), Дзмітрый Балтрукевіч (аўтар слоў, вакал, акустыка). Музыканты прапагандуюць сябе як «жывы» гурт з «жывым» слухачом, таму і такі важны крок, як запіс альбома, вырашылі зрабіць сумесна. Гэта дае магчымасць пераканацца, што ў калектыву ёсць свае прыхільнікі, якім не ўсё адно і яны гатовы падтрымаць музыкантаў у любы час.



Штуршком для напісання песень становіцца любая жыццёвая дробязь, новы досвед ці ўражанне. Напрыклад, загалоўную кампазіцыю Дзмітрый напісаў пасля рэанімацыі, калі пераасэнсоўваў жыццё. І таму музыканты праз творчасць спрабуюць даць падставу задумацца пра нешта важнае...

...Усё пачалося з аўтарскай песні, да якой у хуткім часе дадалася лірыка скрыпкі. Першае выступленне было ў якасці дуэта на свяце вулічнай музыкі ў верасні 2011 года. Далей гурт пачаў хутка папаўняцца новымі ўдзельнікамі і інструментамі, аднак найбольш сфарміраваны гук атрымаў за апошні год. Музыканты прапагандуюць сябе як творцы, не выконваюць кавер-кампазіцый. Назва «Кактэйль Шаляпіна» прыйшла выпадкова. За аснову ўзяты напой для рэаніміравання голасу, які складаецца з мёду, лімона, яйка і каньяку. Сярод спевакоў яго называюць менавіта кактэйлем Шаляпіна.

Гурт не цураецца эксперыментаў, таму падчас сваіх выступленняў музыканты могуць мяняцца месцамі.

— Наш барабаншчык Аляксандр неяк прыйшоў і заявіў, што сёння прэзентаваць свой варыянт песні «Аўгуст Раш». Узяў гітару і заспяваў, я сеў за барабаны... Гэта і было пачаткам хаосу, які мы часам распачынаем на выступленнях *(усміхаецца)*.

У гурта пакуль што няма песень на беларускай мове. Але, па словах вакаліста, толькі часова:

— Я стаўлюся да пытання вельмі сур'ёзна. Лічу, што да гэтага трэба прыйсці, мову трэба адчуваць, а не проста прытрымлівацца трэнду. Тады і песня народзіцца сама, без «прабіркі».

**Кацярына ЛЯСУН.**